Репозиторий БарГУ

УДК 394

**К. А. Губко**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# КІТАЙ ВАЧЫМА БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

Яшчэ нядаўна Кітай для беларусаў здаваўся іншай нязведанай планетай, але ў апошні час узаемасувязі Беларусі і Кітая робяцца больш цеснымі і цёплымі. Усё больш кітайцаў наведваюць нашу гасцінную Беларусь і ўсё больш беларусаў імкнуцца наведаць такі цікавы і незвычайны для нас Кітай.

Кітай — адна з самых буйных, старажытных і загадкавых краін у свеце, гісторыя якой налічвае амаль чатыры тысячы год.

© Губко К. А., 2019

Для мяне Кітай — гэта краіна з непаўторнай архітэктурай, якая спалучае ў сабе старажытныя традыцыі і сучаснасць. Напрыклад Вялікая Кітайская сцяна з’яўляецца вельмі цікавым культурным аб’ектам. Кітайцы лічаць яе сваім неацэнным помнікам архітэктуры. Яна працягнулася на тысячы кіламетраў на поўнач ад Пекіна: пабудавана сцяна была для агароджы межаў імперыі Кітая і абароны ад нападаў паўночных плямёнаў.

Беларусы па сваёй прыродзе вельмі творчыя і таленавітыя людзі, таму кітайскае мастацтва, літаратура, музыка, мода, якія з’яўляюцца непараўнальна ўнікальнымі, таксама вельмі прываблiваюць нас. Для мяне цікавай з’яўляецца традыцыйная кітайская музыка. Яна прыемная на слых, натуральная, вытанчаная, слухаючы такую музыку, адпачываеш душой. Кітайскі кампазітар Дын Шаньдэ пра кітайскую музыку казаў так: «Прыгажосць кітайскай музыкі падобная да золата, рассыпанага ў пяску, яе трэба крапатліва шукаць, не спыняцца» [1].

Мусіць, усім вядома, што кітайцы прыдумалі такі від баявых мастацтваў, як кунг-фу. Ён быў вынайдзена манахамі Шааліня, каб абараніць сябе ад рабаўнікоў на пустэльных горных дарогах. Было б добра, каб і сучасныя людзі ўмелі выкарыстоўваць кунг-фу супраць злачынцаў.

Ці каштавалі вы кітайскія стравы? Кітайская ежа — цэлая культура ці нават культ. Беларуская і кітайская кухні вельмі адрозніваюцца. У Кітаі цэлых восем кухняў. Яны вельмі разнастайныя, існуе шмат варыяцый прыгатавання адной і той жа стравы. Кітайцы вельмі неабыякавыя да вострай ежы. Кітайская кухня немагчыма без рэзкіх затавак: чырвоны, чорны, белы перац, імбір, часнык, бадзян, карыца, лаўровы ліст, чарамша, рэзкія травы — базілік, пятрушка, салера, кінза, мята перачная, кроп і ўсе гатункі цыбулі. Кітайскія стравы вядомыя сваёй колеравай палітрай, водарам і вельмі прывабным выглядам. Найпапулярнейшыя кітайскія стравы — гэта качка па-пекінску (北京烤鸭), свініна ў кісла-салодкім соўсе (糖醋里脊), курыца гунбао (宫保鸡丁), тофу ма па (麻婆豆腐), вантоны (馄饨), пельмені (饺子), смажаная локшына(炒面). Мару пакаштаваць кожную з гэтых страў [2].

Вельмі цікава тое, што тэма ежы адлюстравана ў вялікай колькасці ўстойлівых выразаў або прымавак. Напрыклад, «з’есці воцат» азначае адчуваць зайздрасць або рэўнасць, а «з’есці тофу іншага» — абдурыць, «есці марожанае вачыма» — разглядаць

Репозиторий БарГУ

прадстаўніка іншага полу. А пра чалавека, які страціў працу, кажуць: «ён разбіў свой кубак з рысам» [2].

Кітайцы амаль што не выкарыстоўваюць ложкі і відэльцы, у іх ёсць свае сталовыя прыборы — палачкі. Вы ніколі не задумваліся, чаму менавіта палачкамі ядуць кітайцы, гэта ж, здаецца, так нязручна? У кітайцаў на гэты конт ёсць свае меркаванні. Па-першае, гэта зручна: вандроўніку не трэба было насіць з сабой сталовыя прыборы, паколькі палачкі лёгка выразаліся з любога дрэва. Па-другое, карысна: палачкамі нельга ўзяць ежы больш, чым можна пражаваць. Па-трэцяе, як сцвярджаюць кітайскія лекары, якія спецыялізуюцца на кропкавым масажы, чалавек, варочаючы палачкамі, масажыруе ў час ежы каля 40 жыццёва важных кропак, размешчаных на руцэ. Палачкі маюць і сімвалічнае значэнне. Іх дораць маладым у якасці сімвала згоды і неразлучнасці, а відэлец і нож, наадварот, у кітайскай філасофіі лічацца сімваламі вайны [3].

Кітайцы падаравалі свету чай. Мусіць, не існуе такога чалавека, які хоць раз у сваім жыцці не пакаштаваў гэты цудоўны напой. Вучоныя падлічылі, што за адну секунду на Зямным шары выпіваецца крыху больш за два мільёны кубкаў чаю. Я, напрыклад, не ўяўляю сваё жыццё без чаю. Аказваецца, што першы кубак чаю быў выпіты выпадкова. Згодна кітайскай міфалогіі, у 2737 годзе да н. э. кітайскі імператар Шэнь-нун сядзеў пад дрэвам, пакуль яго слуга падаваў яму гарачую ваду. Некалькі лісточкаў з дрэва ўпалі ў ваду, і імператар вырашыў пакаштаваць напой. Выпіўшы ваду, ён здзівіўся незвычайнаму водару і густу і пажадаў у далейшым спажываць толькі такі напой. Толькі ўявіце сабе! Цяпер у свеце вядома каля тысячы гатункаў кітайскага чаю.

Але сапраўднае багацце Кітая — людзі, якія там жывуць. У свеце кітайцаў ведаюць як вельмі працавітых, ветлівых, удзячных людзей, якія з павагай ставяцца да старэйшага пакалення і вельмі шануюць сямейныя традыцыі. Кітайскія афарызмы вядомы ўсяму свету. Ведаючы прыказкі і прымаўкі, прынятыя да ўжывання ў пэўнай краіне, можна лепш даведацца пра сам народ. У кітайскай мове існуе мноства цікавых «крылатых выразаў», прыказак, прымавак, у якіх закладзены традыцыі і мудрасць Кітая. Вось некаторыя з іх: «Горш смерці бяды няма, бядней жабрака не станеш»; «Напіся, і ты будзеш шчаслівы некалькі гадзін; ажаніся, і ты будзеш шчаслівы некалькі гадоў; пасадзі сад, і ты будзеш шчаслівы ўсё жыццё»; «Не гаварыце, калі гэта не змяняе цішыню да лепшага»; «Няма нічога

Рэпазіторый БарДУ

далей, чым учора, і няма нічога бліжэй, чым заўтра»; «Калі б’юцца два тыгры, перамагае мудрая малпа на дрэве» [4].

Кітайцы — вельмі цікавая нацыя. У іх можна вучыцца жыць. Яны спасціглі нейкі невядомы еўрапейцам сэнс жыцця. Адчуваюць сябе шчаслівымі дзякуючы самым простым і вечным радасцям жыцця. Кітайцы ўражваюць!

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Традиционная музыка Китая [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.vipgeo.ru. — Дата доступа: 10.02.2019.
2. Китайская кухня — обычаи Китая, популярные блюда [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://azialand.ru. — Дата доступа: 10.02.2019.
3. Китайские палочки [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.abirus.ru. — Дата доступа: 12.02.2019.
4. 24 мудрые китайские пословицы и поговорки [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://m-fishki-net.cdn.ampproject.org. — Дата доступа: 12.02.2019.


Репозиторий БарГУ